9. The Taliban Want a Piece of Pakistan // Foreign Policy. – 2023. – URL: https://foreignpolicy.com/2024/02/20/taliban-pakistan-afghanistan-border-dispute/ (date of access: 15.08.2024).
10. Terrorism Is Making a Comeback, and Africa Is the Hot Spot // Foreign Policy. – 2023. – URL: https://foreignpolicy.com/2022/05/06/terrorism-africa-hotspot-isis-boko-haram/ (date of access: 15.08.2024).
11. Don't Betray the Women of Afghanistan // Foreign Affairs. – 2022. – URL: https://www.foreignaffairs.com/afghanistan/dont-betray-women-afghanistan (date of access: 17.08.2024).
12. Афганистан после смены режима: внутренняя и международная неопределенность / И. А. Сафранчук, М. А. Конаровский, Г. Г. Мачитидзе [и др.]. – Москва: МГИМО, 2022. – 32 с.

**(Дата подачи: 08.02.2025 г.)**

*М. С. Мамекін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*M. S. Mamekin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 329.05**

# ЭЎРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СІСТЭМНАГА І СТРУКТУРНА-ФУНКЦЫЯНАЛЬНАГА ПАДЫХОДАЎ ДА АНАЛІЗУ ПАРТЫЙНЫХ СІСТЭМ

# HEURISTIC POTENTIAL OF SYSTEMIC AND STRUCTURAL-FUNCTIONAL APPROACHES TO THE ANALYSIS OF PARTY SYSTEMS

*Артыкул прысвечаны разгляду сістэмнага і структурна-функцыянальнага падыходаў як ключавых інструментаў для аналізу партыйных сістэм. Аналізуецца гісторыя развіцця агульнай тэорыі сістэм, уплыў вядомых вучоных на фарміраванне гэтай міждысцыплінарнай галіны даследаванняў, якая аказала значнае ўздзеянне на фарміраванне і распаўсюджанне абодвух падыходаў. Вызначаецца спецыфіка і ключавыя прынцыпы, якія ляжаць у аснове сістэмнага і структурна-функцыянальнага падыходаў. У выніку аўтар здзяйсняе аналіз асноўных параметраў партыйнай сістэмы, грунтуючыся на прынцыпах правядзення сістэмнага і структурна-функцыянальнага падыходаў, што дазваляе яму прапанаваць уласнае азначэнне партыйнай сістэмы.*

*Ключавыя словы: сістэмны падыход; структурна-функцыянальны падыход; агульная тэорыя сістэм; сістэма; падсістэма; элемент; структура; сувязь; знешняе асяроддзе; функцыя; партыйная сістэма; палітычная партыя.*

*The article is devoted to the consideration of systemic and structural-functional approaches as key tools for the analysis of party systems. The article analyzes the history of the development of the general theory of systems, the influence of well-known scientists on the formation of this interdisciplinary branch of research, which had a significant impact on the formation and dissemination of both approaches. The specifics and basic principles underlying the systemic and structural-functional approaches are determined. As a result, the author analyzes the main*

*parameters of the party system based on the principles of systemic and structural-functional approaches, which allows him to propose his own definition of the party system.*

*Keywords: system approach; structural and functional approach; general theory of systems; system; subsystem; element; structure; communication; external environment; function; party system; political party.*

На сённяшні дзень аднымі з найбольш вядомых інструментаў пазнання палітычнай рэчаіснасці з'яўляюцца сістэмны і структурна-функцыянальны падыходы. Іх эўрыстычны патэнцыял абгрунтаваны і даказаны шматлікімі даследаваннямі. Відавочна, што не меншую каштоўнасць абодва падыходы ўяўляюць і для аналізу партыйных сістэм. Мэта артыкула – вызначэнне сутнасці партыйных сістэм на падставе выкарыстання сістэмнага і структурна-функцыянальнага падыходаў.

Абодва падыходы маюць агульныя карані, якія грунтуюцца на падмурку агульнай тэорыі сістэм. Менавіта па гэтай прычыне варта ў першую чаргу звярнуць увагу на асаблівасці станаўлення і фарміравання агульнай тэорыі сістэм як міждысцыплінарнай галіны даследаванняў.

Паняцце «сістэма» з'явілася ў рускай і беларускай мовах праз французскае système, якое паходзіла ад лацінскага systēma, вытворнага, у сваю чаргу, ад грэчаскага σύστημα, што ў перакладзе азначае «складанне» [1]. У сучасным значэнні сістэма – гэта цэлае, складзенае з частак.

Разважанні на «перадсістэмную» праблематыку, уключаючы пытанне суадносін частак і цэлага, распачынаюцца яшчэ ў Антычнасці і змяшчаюцца ў працах Арыстоцеля, Зянона Элейскага і інш. У Сярэднявеччы «перадсістэмныя» ідэі антычных філосафаў развіваліся ў працах схаластаў, напрыклад Фамы Аквінскага. У працах айчынных даследчыкаў адзначаецца, што ў XVII–XVIII стст. паняцце «сістэма» трывала ўваходзіць у навуковы зварот у Еўропе і на працягу доўгага часу выкарыстоўваецца для абазначэння ўпарадкаваных ведаў. У гэтым сэнсе паняцце «сістэма» выкарыстоўваецца ў назвах трактатаў і сачыненняў аўтараў таго часу: Э. Б. дэ Кандыльяка, П. А. Гольбаха, Ф. В. Й. Шэлінга [2, с. 6–7].

Фарміраванне агульнай тэорыі сістэм прыходзіцца на першую палову XX ст. Ля вытокаў гэтай міждысцыплінарнай вобласці ведаў стаялі А. А. Багданаў, Л. фон Берталанфі і інш. Н. А. Антановіч адзначае, што менавіта А. А. Багданаў (сапраўднае імя – А. А. Маліноўскі) адным з першых адкрыў шэраг сістэмных прынцыпаў і заканамернасцяў у пачатку XX ст. у сваёй працы «Тэкталогія. Усеагульная арганізацыйная навука» (1925–1929). Там ім былі апісаны прынцыпы зваротнай сувязі («падвойнага ўзаемнага рэгулявання») і ўпершыню ў рускамоўнай навуцы быў ужыты тэрмін «сацыяльная сістэма» [2, с. 8–9]. У 1930-я гг. Людвіг фон Берталанфі ўпершыню прапаноўвае стварэнне агульнай тэорыі сістэм, аднак сфармулюе яе асноўныя прынцыпы і палажэнні ён толькі пасля Другой сусветнай вайны. Галоўным дасягненнем вучонага стала, як вядома, распрацоўка агульнай тэорыі сістэм, якая грунтуецца на агульных прынцыпах і законах паводзін

сістэм, не зважаючы на іх тып і прыроду. Навукоўцам было сфармулявана палажэнне, вядомае як «Закона Берталанфі», паводле якога «канчатковы стан адкрытай сістэмы вызначаецца працэсамі, якія працякаюць унутры сістэмы падчас узаемадзеяння з асяроддзем, а не яе пачатковым станам» [3, с. 214].

Не менш важнай постаццю ў працэсе станаўлення агульнай тэорыі сістэм з'яўляецца фізіёлаг У. Кэнана, які выдаў працу«Мудрасць цела» ў 1932 г. Гэта выданне адыграла вялікую ролю ва ўкараненні сістэмнага аналізу ў сацыяльнай навуцы, у прыватнасці ў палітычнай навуцы, непасрэдна паўплываўшы на ўяўленні Д. Істана. Менавіта У. Кэнан упершыню прапаноўвае паняцце «гамеастазіс», якое азначае стан раўнавагі ў сістэме.

Паралельна з агульнай тэорыяй сістэм развіваліся кібернетыка, тэорыі інфармацыі, самарэгуляцыі і гульняў. У канцы 1940-х гг. Н. Вінэрам былі прадстаўлены канцэпцыі кібернетычных сістэм і зваротнай сувязі, якія знайшлі прымяненне ў многіх сферах навуковага мыслення, у тым ліку ў паліталогіі.

Паводле заснавальніка агульнай тэорыі сістэм, сістэма была вызначана як комплекс узаемазвязаных элементаў, які ўтварае цэласнасць і мае ўласныя ўласцівасці, што не зводзяцца да сумы ўласцівасцей яе частак [4]. Прасоўванне агульнай тэорыі сістэм з біялогіі ў іншыя галіны навукі пачалося з заснавання ў 1954 г. у ЗША «Таварыства агульнай тэорыі сістэм» (сёння Міжнароднае таварыства навук аб сістэмах) і выпуску ў 1956 г. штогодніка «Агульныя сістэмы» пад рэдакцыяй А. Рапапорта, Л. фон Берталанфі і інш. [5, с. 234–235].

Агульная тэорыя сістэм і сістэмны падыход хутка набылі папулярнасць па ўсім свеце, у тым ліку і ў СССР. У Савецкім Саюзе з 1960-х гг. выходзіў штогоднік «Сістэмныя даследаванні», які асвятляў развіццё тэорыі сістэм у розных галінах. Да значных савецкіх навукоўцаў, якіх можна лічыць прыхільнікамі агульнай тэорыі сістэм і сістэмнага падыходу, адносяцца: І. В. Блаўберг, Д. П. Горскі, Г. М. Повараў, В. М. Садоўскі, Э. Р. Юдзін, Г. П. Шчадравіцкі і інш.

Сёння сістэмны падыход часта называюць агульнанавуковай метадалагічнай праграмай. Сістэмны падыход – напрамак метадалогіі навуковага пазнання і сацыяльнай практыкі, у аснове якога ляжыць разгляд аб'ектаў як сістэм і які арыентуе даследчыка на раскрыццё цэласнасці аб'екта, на выяўленне шматстайных тыпаў сувязяў у ім і звядзенне іх у адзіную тэарэтычную карціну [6].

Да асноўных прынцыпаў сістэмнага падыходу ў айчыннай навуцы адносяць прынцыпы цэласнасці, эмерджэнтнасці, узаемазалежнасці, іерархічнасці, множнасці апісанняў [2, с. 16]. Расійскі даследчык А. Ф. Шаброў лічыць, што рэалізацыя сістэмнага падыходу патрабуе прытрымлівання трох базавых прынцыпаў: дэкампазіцыі, унутранай узаемазвязанасці

і цэласнасці. Пры гэтым аўтар дадае яшчэ шэсць прынцыпаў, якія ўдакладняюць і дапаўняюць адзін аднаго [3, с. 219–223].

Як мы бачым, сістэмны падыход накіраваны, з аднаго боку, на выяўленне структуры, а з іншага – на раскрыццё цэласнасці сістэмы. Такім чынам, ён аб'ядноўвае ў сабе аналіз (структураванасць, раздзеленасць) і сінтэз (цэласнасць сістэмы). Па гэтай прычыне яго спалучэнне са структурна-фукцыянальным падыходам з'яўляецца не толькі каштоўным, але і непазбежным.

Структурна-функцыянальны падыход мае тыя ж вытокі, што і сістэмны, і ўзнік з напрацовак у галіне актуальнай тэорыі сістэм. Слова «структура» паходзіць ад лацінскага structura – «пабудова», «уладкаванне». У сучасным сэнсе пад структурай разумеецца сукупнасць сувязяў паміж часткамі аб'екта. Слова «функцыя» было запазычана таксама з лацінскай мовы, дзе functio азначала «выкананне», «ажыццяўленне», «здзяйсненне». У сучасным сэнсе пад функцыяй разумеецца месца і роля аб'екта ў межах некаторай сістэмы, да якой ён належыць, і адпаведная дзейнасць [7, с. 783].

Асновы структурнага функцыяналізму закладзены ў працах антраполагаў Б. Маліноўскага і А. Рэдкліф-Браўна, якія разглядалі грамадства як адзінае цэлае, як жывы арганізм у дзеянні. Аўтары вызначылі, што даследаванне структуры грамадства неаддзельнае ад даследавання яго функцый. Аднак структурна-функцыянальны падыход у яго сучасным разуменні сфарміраваўся ў 1940-х гг. у ЗША і звязваецца з імем прафесара сацыялогіі Гарвардскага ўніверсітэта Талкотам Парсансам (1902–1979). Прадстаўнікамі гэтага напрамку лічацца сацыёлагі К. Дэвіс, М. Леві, Н. Луман, Р. Мертан, палітолагі Г. Алманд, Д. Аптэр, Р. Паўэл і інш. [8].

Асноўны метадалагічны прынцып структурна-функцыянальнага аналізу заключаецца ў даследаванні сацыяльна-палітычных з'яў і працэсаў як структурна раздзеленай цэласнасці, дзе кожны элемент мае сваё функцыянальнае прызначэнне. Для прыхільнікаў структурна-функцыянальнага падыходу важна вызначыць, якія структуры выконваюць тыя ці іншыя функцыі.

У грамадскіх навуках першапраходцам ва ўжыванні тэорыі сістэм і яскравым прадстаўніком структурнага функцыяналізму лічыцца амерыканскі сацыёлаг Т. Парсанс. Ён стварыў сістэмную тэорыю грамадства, разглядаючы яго як цэласнасць, якая складаецца з чатырох падсістэм, што ўзаемадзейнічаюць і выконваюць знешнія і ўнутраныя функцыі. Хаця аўтар і вылучыў падсістэму палітыкі, вызначыўшы яе функцыі, ён не вылучаў партыйную сістэму, што ўжо было зроблена прадстаўнікамі палітычных навук.

У палітычнай навуцы адным з першых прыхільнікаў сістэмнага падыходу быў канада-амерыканскі даследчык Дэвід Істан. У сваёй палітычнай сістэме даследчык акцэнтуе ўвагу на ўласцівасцях сістэмы, якія адлюстроўваюць яе функцыянаванне. Аўтар вызначае палітычную сістэму як сукупнасць узаемадзеянняў, з дапамогай якіх каштоўнасці аўтарытарным

спосабам прыўносяцца ў грамадства [9, с. 93]. Выкарыстоўваючы сістэмны падыход і кібернетычную мадэль, ён, па сутнасці, вызначае партыйную сістэму як частку палітычнай сістэмы, вызначыўшы яе месца і функцыі.

Як адзначае А. Ф. Шаброў, дзякуючы прадстаўніку структурна-функцыянальнга падыходу Г. Алманду зацвердзілася інстытуцыянальнае прадстаўленне структуры палітычнай сістэмы. Сучасныя даследчыкі, аднак, вывучаюць палітычную сістэму ў сістэмна-кампанентным або сістэмна-структурным аспекце, разглядаючы як кампаненты тыя інстытуты, якія ўдзельнічаюць у вырабе і ўзнаўленні палітычнай улады. Асноўнымі кампанентамі з'яўляюцца дзяржава як ядро палітычнай сістэмы і палітычныя інстытуты, такія як партыі, групы ціску і грамадска-палітычныя рухі [3, с. 226–227]. Пры гэтым Г. Алманд у якасці асноўнай функцыі партый вылучыў функцыю агрэгавання інтарэсаў.

Значны ўнёсак у даследаванне праблематыкі партыйных сістэм зрабілі такія аўтары, як Ж. Бландэль, А. Вайр, Г. В. Голасаў, М. Дзюверэжэ, Б. А. Ісаеў, І. В. Катляроў, А. Лейпхарт, Б. І. Макаранка, П. Мэйр, З. Нойман, У. Райкер, Д. Сарторы, А. Сіароф і інш. Заснавальнікам тэорыі партыйных сістэм часта называюць М. Дзюверэжэ, які прысвяціў аналізу партыйных сістэм другую частку сваёй працы «Палітычныя партыі». Аднак у сваёй працы М. Дзюверэжэ не абапіраўся на агульную тэорыю сістэм, таму партыйную сістэму як сукупнасць «формаў і спосабаў» суіснавання партый ён разумеў з дастатковай ступенню ўмоўнасці і браў гэта паняцце ў двукоссе. Хаця М. Дзюверэжэ і вылучае пэўныя элементы аналізу партыйных сістэм, да якіх ён адносіць тыпы партыйных структур, колькасць партый, іх колькасныя параметры, саюзы (кааліцыі) партый, іх геаграфічную лакалізацыю, размеркаванне ў палітычным спектры [10], такая пазіцыя не ў поўнай меры раскрывае патэнцыял сістэмнага і структурна-функцыянальнага падыходаў.

З пазіцый вышэйзгаданых падыходаў можна заключыць, што партыйная сістэма:

1) з'яўляецца адносна самастойнай структурай, якая захоўвае сваю цэласнасць, нягледзячы на знешнія ўздзеянні. Напрыклад, рост беспрацоўя ці санкцыйны ціск не разбураюць цэласнасці партыйнай сістэмы;

2) мае ўласцівасці, якія не зводзяцца да простай сумы яе кампанентаў. Узаемадзеянне партый стварае новыя якасці, як, напрыклад, стабілізацыя (амартызацыя) палітычнай сістэмы да знешняга ўздзеяння і генерыраванне ў працэсе палітычнай канкурэнцый ці супрацоўніцтва цэннасна-нарматыўных вектараў развіцця палітычнай сістэмы і інш.;

3) выяўляе свае ўласцівасці праз узаемадзеянне з грамадствам, дзяржавай і іншымі палітычнымі і сацыяльнымі інстытутамі. Партыйная сістэма рэагуе на знешнія імпульсы, напрыклад, міжнародны эканамічны крызіс праз стварэнне партыямі праграм і стратэгій вырашэння крызіснай сітуацыі, у выніку чаго адбываецца стабілізацыя (амартызацыя) палітычнай сістэмы да знешняга ўздзеяння;

4) уяўляе сабой множнасць элементаў, кожны з якіх павінен разглядацца як самастойная сістэма. Паводле гэтага прынцыпу паняцце «аднапартыйная сістэма» не адпавядае сістэмнаму падыходу, бо сукупнасць з аднаго элемента не можа лічыцца сістэмай. Можна пагадзіцца з меркаваннем А. Ф. Шаброва, што ў такім выпадку гаворка можа ісці толькі пра выраджаную сістэму [3, с. 216]. Аднак і мноства зарэгістраваных у краіне партый яшчэ не нараджае сістэмнай цэласнасці, якая можа лічыцца шматпартыйнай сістэмай, бо могуць адсутнічаць іншыя неабходныя сістэмныя параметры. Гэта сцвярджэнне справядліва ў дачыненні да сукупнасці існуючых у Беларусі да чэрвеня 2023 г. партый. Пры гэтым кожная партыя – асобная сістэма, якая характарызуецца шэрагам сістэмных параметраў, сярод якіх разнародныя элементы (структурныя падраздзяленні, члены партыі), структура (сетка ўзаемасувязяў элементаў, іх іерархія і ўзаемнае размяшчэнне ў межах партыі), асяроддзе (сукупнасць сувязяў партыі з навакольным асяроддзем), функцыі партый (напрыклад, прадстаўнічая, праграмна-ідэалагічная, функцыя палітычнай сацыялізацыі, палітычная, падсістэмы (кіраўнічай падсістэмы, падсістэм унутрыпартыйных фракцый і інш.);

5) для глыбокага разумення партыйнай сістэмы неабходна выкарыстоўваць некалькі падыходаў. Яе можна аналізаваць з пункту гледжання ідэалогіі, арганізацыйнай структуры, сацыяльнай структуры грамадства, электаральных паводзін і інш.

Цяпер варта апісаць асноўныя параметры партыйнай сістэмы.

Элементамі партыйнай сістэмы з’яўляюцца асобныя палітычныя партыі. Кожная партыя – гэта асобны кампанент сістэмы, які валодае сістэмнымі параметрамі, апісанымі вышэй.

Структура партыйнай сістэмы – гэта сетка ўзаемасувязяў паміж партыямі, якая вызначае іх узаемадзеянне і размяшчэнне ў палітычнай прасторы. Гэта мадэль узаемасувязяў уключае іерархію партый, іх пазіцыі адносна адна адной, якія фарміруюцца паводле ўзаемадзення ў розных вымярэннях сацыяльнай сістэмы. Да такіх вымярэнняў можна аднесці апісаныя Б. А. Ісаевым палі партыйнай сістэмы, сярод якіх аўтар вылучае сацыяльнае, электаральнае, ідэалагічнае, парламенцкае і ўрадавае [4, с. 240–241]. У сённяшніх умовах інфарматызацыі грамадства, узрастання ролі Інтэрнэта, сацыяльных медыя і сацыяльных сетак можна вылучыць яшчэ адно вымярэнне – інфармацыйнае поле.

Да падсістэм партыйнай сістэмы, якія ўяўляюць сабой адносна незалежныя часткі партыйнай сістэмы, можна аднесці падсістэмы правячых і апазіцыйных партый, кааліцыйныя падсістэмы некалькіх партый, заснаваных, напрыклад, на ідэалагічнай блізкасці, і інш.

Знешняе асяроддзе партыйнай сістэмы – гэта сукупнасць фактараў і ўмоў, якія знаходзяцца за межамі самой партыйнай сістэмы, але аказваюць на яе прамое або ўскоснае ўздзеянне. Абапіраючыся на даследаванні Д. Істана, які вылучыў экстрасацыятальнае і інтрасацыятальнае асяроддзі

палітычнай сістэмы, можна класіфікаваць і асяроддзе партыйнай сістэмы, якая з'яўляецца складнікам сістэмы палітычнай. Такім чынам, атрымаем наступныя вымярэнні асяроддзя: макраасяроддзе – знешнія ў дачыненні да канкрэтнага соцыуму ўздзеянні (эканамічныя санкцыі, ваеннае ўмяшанне, інфармацыйны ціск, экалагічныя катастрофы і інш.); мезаасяроддзе – унутраныя ў дачыненні да канкрэтнага соцыуму ўздзеяння, якія зыходзяць ад іншых падсістэм соцыуму (рост беспрацоўя, высокая інфляцыя; змены ў сацыяльнай структуры грамадства; з'яўленне розных этнічных, рэлігійных або культурных груп і інш.); мікраасяроддзе – уздзеянні, якія зыходзяць ад іншых складнікавых элементаў палітычнай сістэмы (адстаўка ўрада; змена інстытуцыянальнага дызайну ўнутры краіны; рэфармаванне выбарчай сістэмы і інш.).

Сувязі ў партыйнай сістэме – гэта ўзаемадзеянне паміж партыямі, а таксама іх сувязі з грамадствам, дзяржавай і іншымі сацыяльнымі і палітычнымі інстытутамі. Гэты параметр партыйнай сістэмы характарызуе кааліцыйныя пагадненні, стварэнне партыйных блокаў, палітычную канкурэнцыю і інш.

Функцыі партыйнай сістэмы:

• стабілізацыя (амартызацыя) палітычнай сістэмы да знешняга ўздзеяння – партыйная сістэма забяспечвае палітычную канкурэнцыю і механізмы адаптацыі, якія дазваляюць сістэме эфектыўна рэагаваць на знешнія выклікі, зніжаючы рызыку канфліктаў і забяспечваючы ўстойлівасць;

• генерыраванне ў працэсе палітычнай канкурэнцыі ці супрацоўніцтва цэннасна-нарматыўных вектараў развіцця палітычнай сістэмы – палітычная канкурэнцыя сярод партый спрыяе стварэнню і развіццю цэннасна-нарматыўных арыенціраў, якія акрэсліваюць палітычны курс і стратэгіі, адлюстроўваючы інтарэсы грамадства;

• падрыхтоўка і адбор новых палітычных лідараў – партыйная сістэма выступае як платформа для выяўлення і развіцця новых палітычных лідараў, якія могуць прадстаўляць інтарэсы грамадства і прымаць удзел у кіраванні палітычнымі працэсамі, спрыяючы абнаўленню палітычнай эліты.

На падставе выкарыстання спалучэння сістэмнага і структурна-функцыянальнага падыходаў можна заключыць, што партыйная сістэма (у межах артыкула, у адрозненне ад шэрагу публікацый [11–13], мы наўмысна пазбягаем апісання ліку і канкрэтных дыферэнцуючых якасцей элементаў, якія трэба адносіць да партыйнай сістэмы, такіх як прадстаўленасць у парламенце, легальнасць, наяўнасць кааліцыйнага ці шантажнага патэнцыялу і інш.) уяўляе сабой пэўную множнасць партый, якая ўтварае цэласнасць і з'яўляецца адкрытай, арганічнай і дынамічнай сістэмай. Падсумоўваючы, вызначым, што партыйная сістэма ёсць пэўным чынам структураваная сукупнасць партый у краіне, якая адрозніваецца канкрэтным іх узаемным размяшчэннем і роляй у палітычнай прасторы, якія фарміруюцца паводле ўзаемадзення партый у розных вымярэннях сацыяльнай сістэмы (сацыяльным,

электаральным, ідэалагічным, парламенцкім, урадавым і інфармацыйным), якой уласціва асаблівая мадэль узаемаадносін (непасрэдна паміж гэтымі палітычнымі партыямі, паміж імі і дзяржавай і паміж імі і іншымі грамадскімі інстытутамі), звязаная з выкананнем канкрэтных функцый у межах усёй палітычнай сістэмы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Этимологический онлайн-словарь русского языка Макса Фасмера. – URL: https://clck.ru/3GdbVd (дата обращения: 03.01.2025).

2. *Антанович, Н. А.* Теория политических систем: учеб. пособие / Н. А. Антанович. – Минск: ТетраСистемс, 2008. – 208 с.

3. *Шабров, О. Ф.* Системный подход в политической науке / О. Ф. Шабров // Современная политическая наука: методология / отв. ред. О. В. Гаман-Голутвина, А. И. Никитин. – 2-е изд., испр. и доп. – Москва: Аспект пресс, 2019. – 776 с.

4. *Берталанфи, Л.* Общая теория систем – критический обзор / Л. Берталанфи // Исследования по общей теории систем. – Москва: Прогресс, 1969. – С. 23–82.

5. *Исаев, Б. А.* Теория партий и партийных систем: учеб. пособие / Б. А. Исаев. – Москва: Аспект Пресс, 2008. – 367 с.

6. *Блауберг, И. В.* Становление и сущность системного подхода / И. В. Блауберг, Э. Г. Юдин. – Москва: Изд-во «Наука», 1973. – 271 с.

7. *Леонов, Н. Н.* Функция / Н. Н. Леонов // Новейший философский словарь / сост. А. А. Грицанов. – Минск: Изд-во В. М. Скакун, 1998. – 896 с.

8. *Решетников, С. В.* Становление методологии функционального подхода в политической науке / С. В. Решетников, Т. С. Решетникова // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2011. – № 1. – С. 98–105.

9. Политология: хрестоматия / сост.: Б. А. Исаев, А. С. Тургаев. А. Е. Хренов. – Санкт-Петербург: Питер, 2006. – 464 с.

10. *Дюверже, М.* Политические партии: пер. с фр. / М. Дюверже. – 3-е изд. – Москва: Акад. проект: Королев: Парадигма, 2005. – 544 с.

11. *Абзалбеков Б. С.* Анализ основных теоретико-методологических подходов к исследованию партийных систем / Б. С. Абзалбеков // Вестник Омского университета. Серия «Исторические науки». – 2017. – № 1. – С. 54–59. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/analiz-osnovnyh-teoretiko-metodologicheskih-podhodov-k-issledovaniyu-partiynyh-sistem (дата обращения: 27.02.2025).

12. *Дюгурова, А. И.* Партийные системы: введение в проблему / А. И. Дюгурова // Актуальные вопросы современной науки. – 2009. – № 9-1. – С. 21–31. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/partiynye-sistemy-vvedenie-v-problemu (дата обращения: 27.02.2025).

13. *Дюгурова А. И.* Партийные системы как институт политического пространства: основные характеристики // Наука и современность. – 2010. – № 5-2. – С. 9–13. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/partiynye-sistemy-kak-institut-politicheskogo-prostranstva-osnovnye-harakteristiki (дата обращения: 27.02.2025).


**(Дата подачи: 28.02.2025 г.)**